# Буся

чытанка-маляванка для дашкольнікаў

5
2019



# Вершы на памяць

Сяргей ГРАХОЎСКІ

## Верасень

І туманныя слівы і яблыкі — вось яны —
На саломе ляжаць у іскрынках расы,
Пахнуць мёдам і верасам сонечнай восені,
І рыпяць па дорогах цяжкія вазы.

Янка КУПАЛА

## Лістапад

З буйных ліп і бяроз
Лісты валяцца.
Між павалаў і лоз
Рассыпаюцца.

Шапацяць, шалясцяць
Залацістыя,
Увысь галінкі глядзяць
Пусталістыя.

Авяр'ян ДЗЕРУЖЫНСКІ

## Восень

Сохнуць кветкі,
Жоўкнуць травы,
Вее вецер
Неласкава.
З дрэў сілком
Лісты зрывае,
Сум і скруху
Навявае.

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ

## Лісце

Глянь на зямлю залатую,
Пяшчотную, сумную, чыстую,
Нехта па ёй вандрue,
У паветра ўзнімаючы лісце.

Яўгенія ЯНІШЧЫЦ

## Дуброва

Прыносіць мне дары свае дуброва
То верас, то крыніцу, то грыбок.
Уліваецца, нібы ручай, у мову
Палескі нетаропкі гаварок.

Уладзімір ДУБОЎКА

## Залатая раніца

Залатая, асенняя раніца!
Хараством ты на свеце адна.
Сонца ў пушчы глыбокай купаецца
І ніяк не дастане да дна…

Малюнак Наталлі Тайўстанес

Алесь ЕМЯЛЬЯНАЎ-ШЫЛОВІЧ

# ВОЖЫКІ

**Гісторыя пятая. Гуканне лета**

На дварэ было кепска. Дождж лупіў у шыбы, быццам хацеў іх выбіць, вецер гнуў долу дрэвы і кусты. Стэфан сядзеў ля вакна і назіраў непагадзь.

— Эх… — уздыхнуў вожык.

— Чаго ўздыхаеш, Стэфік?

— Я хацеў пагуляць на вуліцы, а там хало-о-одна… Чаму так, мам?

— Гэта восень, мой маленькі. Увосень заўсёды так. Усё ў прыродзе ўладкавана. Цёплае лета, дажджлівая восень, халодная зіма і вясна.

— Вось я і ўздыхаю… хачу цяпла, лета хачу. Мама, давай зробім лета.

— Можа, дачакаемся тату? Ён хутка будзе дома.

Сапраўды, праз колькі хвілін з працы прыйшоў тата Рыгор.

— Вух, ну і халадэча, — ён пахукаў на пальцы і расцёр лапкі. — Такой парой толькі з кубкам кавы пад коўдрай сядзець.

— Не, тата, мы вырашылі зрабіць лета! — радасна паведаміў Стэфан.

— А як гэта?

— Глядзі, у нас ёсць люстра, яна будзе замест сонейка, можна апрануцца па-летняму, напампаваць надзіманы матрац, надзець цёмныя акуляры і легчы загараць. Як табе? — вожык яўна быў задаволены сваёй прапановай.

— Нават і не ведаю, што сказаць. Давайце паспрабуем.

Тата Рыгор палез на антрэсолі па матрац, мама знайшла свой купальнік. Вожыкі ўлегліся на матрац. Праз некаторы час тата, зняўшы сонцазатульныя акуляры, сказаў:



— Можа, пагуляем у якую-небудзь летнюю гульню?

— Давайце! — вожык загойсаў па матрацы. — А ў якую?

— Давайце ў мячык? — прапанавала мама. — У вожыкбол, напрыклад.

— Згода. Вожыкбол я люблю, — пагадзіўся тата Рыгор.

Тут я дазволю сабе трошкі патлумачыць нашым чытачам, што гэта за гульня. Дык вось, вожыкі становяцца адзін насупраць аднаго і носікамі перакідваюць мячык. Вожыкбол — другая па папулярнасці гульня ў калючым сямействе пасля клубочкаў.

Пасля гульні мама сказала:

— А цяпер абедаць. Хуценька мыць рукі і за стол.

— Мама, а як жа лета? — засмуціўся малы вожык.

— Лета нікуды не дзенецца. Потым яшчэ пагуляем.

Пасля абеду Стэфан сказаў:

— А давайце пагуляем у клубочкі! Гэта таксама летняя гульня.

Бацькі пагадзіліся. І ўсім было цёпла, весела, светла. Дождж за вакном скончыўся і — хочаце верце, хочаце не — з’явілася сапраўднае сонейка. Сваімі рукамі-промнямі яно быццам запрашала ўсіх на двор, і Стэфан з бацькамі выправіліся на прагулку. Быў ціхі вечар.

— А гэтая пара, Стэфан, завецца бабіным летам, — сказала мама Агнія.

— Дык да нас прыйшло лета? — усцешыўся Стэфан.

— Ну, можна і так сказаць, — усміхнуўся тата Рыгор.

— Ура! Сапраўднае лета! — заскакаў вожык. — Лета прыйшло да мяне ў госці!

— Ну, сынок, яно прыйшло да ўсіх, — паправіла яго матуля.

— Але ж паклікаў яго я, — не разгубіўся Стэфан.

— Дзякуй, сынок, цяпер мы будзем ведаць, каму быць удзячнымі. Ты малайчына! — пахваліў яго тата Рыгор.



*Малюнкі Аксаны Аракчэевай*

Алег ГРУШЭЦКІ




## Жук

Жук над Жодзіна дзень кружыць,
Жвавы жук, жыве, не тужыць
Сеў на жэрдку: — Як тут гожа!
Як жа Жодзіна прыгожа!




## Котка

Котка крочыць крохкім крокам
І за мышкай сочыць вокам.
Мышка ў норку знікла скокам
Котка — скок, захрасла бокам.



## Лось

Лось вялікі заблукаў
Ва ўласным лесе.
Ветліва бусла спытаў,
Што ляцеў з Палесся.

— Мілы бусел, пакажы
Шлях крылом дадому.
Бусел: — Кля! За мной бяжы!
Будзеш каля дому.








## Рыбак

Раз рыбак паехаў у Ракаў
Палавіць у рэчцы ракаў.
Ракі ў рэчцы той не жылі
Толькі тры фарэлі плылі.

Замест ракаў тры фарэлі
На яго з вядра глядзелі.
Хоць вярнуўся ён без ракаў,
Наш рыбак не вельмі плакаў.

## Шыншыла

Пад шыпшынаю шыншыла
Шалік шоўкавы знайшла,
Упрыгожыла ім шыю
І да мышачкі пайшла.



*Малюнкі Сяргея Волкава*

Вольга ГРАМЫКА

# Новыя хвасты для зайцоў

У адным лесе сустрэліся два зайцы і сталі наракаць на сваё жыццё:

— Бедныя мы бедныя, усіх мы баімся, ад усіх уцякаем, нават схавацца не можам, — выціраючы лапкай слёзы, паскардзіўся віславухі заяц.

— Што ні кажы, а трэба нешта прыдумаць, — пачухаўшы патыліцу, выказаўся заяц, у якога з вушамі было ўсё добра.

— Мне здаецца, што ўсе нашы непрыемнасці ад хваста. Мне чапля расказвала, што ў Афрыцы жывуць хвастатыя малпы. У іх не жыццё, а адно задавальненне. Зачэпяцца хвастамі за галінкі і схаваюцца ў лістоце, нікога не баяцца.

— А давай мы сабе зробім хвасты, як у малпаў, — прапанаваў віславухі заяц.

— Усе нашы беды і знікнуць.

Сказана — зроблена. Цэлы дзень майстравалі зайцы сабе новыя хвасты. Іх працай зацікавілася сарока.

— І чым гэта вы займаецеся? — застракатала яна.

— Адчапіся, белабокая, не да цябе нам зараз, — дзелавіта адказаў віславухі.

Але сарока пакідаць іх не збіралася, а з дальняй бярозы працягвала назіраць за зайцамі.

Нарэшце хвасты былі гатовы. Зайцы пазбавіліся ад сваіх маленькіх куцых хвосцікаў, кінулі іх каля пянька і прычапілі новыя, доўгія. Каб паглядзець, як яны рухаюцца, зрабілі зарадку. Засталіся вельмі задаволеныя сваімі новымі хвастамі.

Сарока ад здзіўлення ледзь не звалілася з бярозы. Ну і ну, такога цуду яшчэ не бачыла! Ёй стала вельмі цікава, чым жа ўсё гэта закончыцца.

— Вось цяпер мы зможам ад ворагаў схавацца на дрэве, ніхто нам не страшны, — бадзёра пахваліўся заяц, у якога з вушамі было ўсе ў добра, і для перакананасці падняў хвост трубой.

І тут у лесе пачуўся брэх сабак.

— Уцякаем, гэта паляўнічыя, — баязліва тузануў за лапку таварыша віславухі заяц.

Зайцы зусім забыліся, што іх новыя хвасты дапамогуць ім учапіцца за галінку дрэва і схавацца ад ворагаў. Яны кінуліся да кусціка шыпшыны, які рос непадалёку. Гэты кусцік не раз ратаваў іх ад бяды. Сіганулі зайцы пад куст, ды не так усё проста. Іх доўгія хвасты зачапіліся за калючкі шыпшыны і моцна іх трымалі. Тузаюцца зайцы, крычаць, плачуць, а зрушыцца не могуць.

Сарока спачатку пацяшалася з іх, а потым сама спалохалася. Парады пачала даваць. Нарэшце тузанулі зайцы свае хвасты, і тыя так і павіслі на кусце шыпшыны. Сарока паляцела па лесе разносіць вестку аб тым, што здарылася з зайцамі. Лясныя жыхары ад душы смяяліся з гэтай прыгоды.

Зайцы пайшлі шукаць свае маленькія куцыя хвосцікі, якія ніколі не перашкаджалі ім хавацца ў кустах шыпшыны, уцякаць ад ворагаў. Знайшлі іх на тым жа месцы. З хуткасцю маланкі нашы героі пачапілі свае хвосцікі. А заяц, у якога з вушамі было ўсё у парадку, пагладзіў лапкай свой хвосцік і сур`ёзна дадаў:

— Новае — не значыць лепшае.



*Малюнак Віталя Дударэнкі*

Аксана СПРЫНЧАН

# Узвіжанне

## Верш пра восень

Пад Птушыным Шляхам
Шлях вужоў у вырай.
Збожжа ўсё пад дахам,
Дождж гучыць, як ліра.

На ключы замкнула
Галка дзіва-лета
І крылом махнула
Роднаму сусвету.

І на журавіны
Час прыйшоў балотны,
У зіме-краіне
Сцішаць нам самоту.







# Як Курачка Пеўніка ратавала

*Беларуская народная казка*

**Дзейныя асобы:**
А п а в я д а л ь н і к
К у р а ч к а
П е ў н і к
К а р о в а
К а с ц ы
П е к а р

А п а в я д а л ь н і к: Жылі-былі Курачка і Пеўнік. Курачка яйкі несла, а Пеўнік зярняткі здабываў, Курачку частаваў. Выграбе з ямкі зярнятка і кліча Курачку:

П е ў н і к: Ко-ко-ко, Чубатка, знайшоў зярнятка!

А п а в я д а л ь н і к: Вось аднойчы выграб Пеўнік вялікую бобінку. «Ну, — думае, — гэтага зярняці Курачцы не праглынуць, з’ем хіба сам». Праглынуў — ды і падавіўся. Паваліўся пеўнік, ногі задраў і не дыхае.

Падбегла да яго Курачка

К у р а ч к а: Што з табою, Пеця? Чаму ты ляжыш і не дыхаеш?

П е ў н і к: Ой, бобінкай падавіўся…

К у р а ч к а: Як жа цябе ратаваць, Пеця?

П е ў н і к: Трэба масла дастаць, горла змазаць.

К у р а ч к а: А дзе яго дастаць?

П е ў н і к: У каровы.



# Выражы і склей героЯў казкі

Пажадана ўсіх герояў перамаляваць з часопіса на шчыльную паперу і пасля выразаць. Тады твой любімы “Буся” застанецца з цэлымі старонкамі.





Апавядальнік: Пабегла Курачка да каровы.
Курачка: Карова, карова, дай масла!
Карова: Нашто табе масла?
Курачка: Пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.
Карова: Добра, дам я табе масла. Але схадзі спярша да касцоў, папрасі сена.
Апавядальнік: Прыйшла Курачка да касцоў:
Курачка: Касцы, касцы, дайце сена!
Касцы: Нашто табе сена?
Курачка: Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.
Касцы: Схадзі да пекара, папрасі пірагоў. Пірагі мы з’ядзім, тады і сена накосім.
Апавядальнік: Прыйшла курачка да пекара:
Курачка: Пекар, пекар, дай пірагоў!
Пекар: Нашто табе пірагі?
Курачка: Пірагі — касцам. Касцы накосяць сена. Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.
Пекар: Збегай у лес, прынясі дроў, каб было на чым пірагі пячы.
Апавядальнік: Пабегла Курачка ў лес і прынесла дроў. Пекар напёк пірагоў. Занесла Курачка пірагі касцам. Касцы з’елі пірагі і накасілі сена.
Прынесла Курачка сена карове. Карова з’ела сена і дала масла.
Пеўнік змазаў маслам горла і праглынуў бобінку. Праглынуў і зноў весела на ўвесь двор заспяваў:
Пеўнік: Ку-ка-рэ-ку! Чуб-чубатка — маладзец!
Апавядальнік: Тут і казачцы канец.





Ірына ЗІМНЕВА

# Маміна памочніца



Дай мне, мам, муку, тварог,
Буду я пячы пірог!
Я ж такая гаспадыня —
Толькі хто ж мне міску здыме?
Хто ж яечкі разаб’е?
І ў духоўку торт запхне?
Гатаваць — гэта не проста,
Ды з такім маленькім ростам...
Мам, сама вазьмі тварог
І гатуй хутчэй пірог!
Заадно згатуй рагу,
А я з’есці памагу.

# Непаслухмяныя чытачы



Тут некалі быў чалавечак,
А тут, хіба, пара авечак,
А тут вось шматок ад старонкі
І капыток ад кароўкі.
Тут пляма мо ад аладкі?
А можа, алей з салаткі?
А тут дамалёвана муха,
А ў коціка — трэцяе вуха.
Тут вокладку ў кнізе падралі.
Так неслухі-дзеці чыталі!

Уладзімір ЛІПСКІ

# Сон

*Казка- забаўлянка пра літары*

Сыну Самсона Сымону сасніўся сон: стары сом саліў срабрыстую салаку, складваў у слоік.

Сымон спытаў:

— Слухай, сом, салёнай салацэ страшна?

— Не страшна, а смешна, — сказаў сом. — Скача, як спалоханая.

— Сом-свавольнік, спачатку сябе абсып соллю.

— С-сымон, с-супакойся.

— Сыч сівы, пусці салаку!..

Сом-таўстун сыпануў соллю ў Сымона. Спрытна Сымон адхіснуўся, па-снайперску пусціў стралу ў сома. Вусач сярдзіта застагнаў:

— С-сорамна сыну Самсона Сымону пускаць стралу ў старога сома.

— А старому сому не сорамна саліць соллю салаку?

Спрачаліся сом і Сымон. Спрасоння Сымон стаў скідваць з сябе прасціну:

— С-сом!..С-сам!.. С-соль!.. С-стой!..

Сонца свяціла ў спальню. Прачнуўся Сымон. Паснедаў. Сеў за стол. Старанна пісаў у сшытак словы з літарай С.

Сымон сказаў сястры Соні:

— Соня, дзівіся: С — як месячык!..

Сястра ўсміхнулася:

— Вось месячык і пасылае Сымону страшныя сны.




Малюнак Віталя Дударэнкі

# БУСЕВА ШКОЛКА

Дружа! Каб чароўны паравозік зрушыў з месца, дапамажы яму адшукаць літару, якую можна пакласці ў кожны вагон, каб утварылася слова. Ніжэй у слупках ты пабачыш падказкі: якія словы павінны атрымацца. Што ж, паехалі!




| | | | |
|---|---|---|---|
| там | бас | пах | рак |
| сам | вас | дах | бак |
| дам | нас | жах | лак |
| вам | час | мах | так |
| нам | пас | гах | мак |
| гам | | бах | |



## Хто намаляваны на карцінцы?

Перастаў літары ў правільным парадку — і атрымаеш назву.






рана
раса
каса
рака
сабака
нара

**Што ела Дана.**

каша
сала
салата
кава
...

*Падрыхтаваў заданні Анатоль Клышка*




Малюнак Алены Велянцэвіч

## БУСЯ ЧЫТАЕ — І ЦЯБЕ ЧЫТАЦЬ ЗАПРАШАЕ!

Дружа, вось і наступіла залатая восень. Прыгожая пара, ці не праўда? Можна пайсці на вуліцу збіраць лісце для гербарыя да Дня настаўніка або да Дня маці. А пасля сесці дома ў цяпле і ўтульнасці ды пачытаць усёй сям'ёй цікавую кнігу.

"З Днём народзінаў, або Свята, якое ёсць у кожнага". Гэты зборнік вершаў, апавяданняў і казак выйшаў у выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў афармленні Міхаіла Дайлідава. З яго ты даведаешся, як святкуе свой дзень нараджэння Варона, а свае імяніны — свінка Марта, і яшчэ шмат-шмат чаго вясёлага і забаўнага. Як, напрыклад, піша паэт Віктар Шніп:

Пеўню на дзень нараджэння
З лесу ліс прынёс варэння.
Ад мядзведзя-лежабокі
Пяць рублёў далі сарокі.

А калі табе захочацца, дарагі дружа, прыгадаць, як прайшло тваё лета, колькі ўсяго цікавага ты пабачыў і пачуў, куды павандраваў — ёсць для цябе цудоўная, ярка ілюстраваная кніга "Беларускае лета". Аднак і да зімы рыхтавацца не забудзь! Табе ў дапамогу — апавяданні Ядвігі Бяганскай "Дзе начавалі рукавічкі" з серыі "Жывая класіка дзецям".

*Твой Буся*










**Родным Бусем ганаруся,**
**Ганаруся Беларуссю!**
**На любімы свой часопіс**
**Тэрмінова падпішуся!**

Індэкс для індывідуальных падпісчыкаў 00142, для ведамасных 001422.



# Бусеў слоўнічак

# Я

Буся вучыць словы з **Я**:
**Яшчарка, янот, ягня**,

**Яблыня, язмін, яліна**,
Шоўк, інакш **ядваб**, – тканіна.

Ёсць **яшчэ ядловец, явар**,
**Яр, яечня, ястраб, ява**.

Жонку мужавага брата
Зваць **ятроўкаю** прынята.

Слоў у слоўнічку багата!
Іх усе запомніць варта!

*Тэкст Святланы БОГУШ*
*Малюнак Аксаны Аракчэевай*



*Літара Я — апошняя ў алфавіце, а значыць, мы разам з Бусем завяршылі ствараць і чытаць слоўнічак. Аднак багацце нашай роднай мовы бязмежнае, таму і далей на старонках чытанкі-маляванкі вы будзеце адкрываць для сябе яе скарбы.*

*А мы з Бусем будзем вельмі рады, калі вы (з дапамогай мам і тат, настаўнікаў і выхавальнікаў) напішаце нам, якія новыя словы дапамог вам засвоіць "Бусеў слоўнічак", якія героі вершаў запомніліся. А можа, у вас ёсць свае цікавыя гісторыі пра родную мову? Абавязкова пішыце і дасылайце на электронную пошту vyaselka2011@yandex.by.*

Конкурс Зялёная жабка



*Максім Бірукоў, 5 гадоў, г. Гомель*



*Ева Пятрова, 5 гадоў, г. Гомель*



*Арына Фрадкіна, 6 гадоў, г. Гомель*

**«Буся»**
чытанка-маляванка
для дашкольнікаў
Пераможца
Нацыянальнага конкурсу
«Залатая Ліцера» (2014)

**ЗАСНАВАЛЬНІК**
Установа “Рэдакцыя
часопіса “Вясёлка”
Адрас рэдакцыі:
220073, Мінск, вул. Кальварыйская, д. 25.
Тэлефоны:
200-92-61, 200-91-90
200-81-92, 204-62-83

**Галоўны рэдактар**
**Уладзімір ЛІПСКІ**

**№5 (38) кастрычнік 2019**

Падпісана да друку: 05.10.2019
Фармат 60x84 1/8. Папера мелаваная.
Афсетны друк. Ул.-выд. арк. 3.
Ум.-друк. арк. 2,8. Ум. фарбаадб. 11,2.
Тыраж 1220 экз.
**Адрас сайта: www.veselka.by**
**E-mail: vyaselka2011@yandex.ru**

**Выходзіць раз на два месяцы**
Аддрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ТАА «ТМ АРГО-ГРАФИКС»,
220113, г. Мінск, вул. Гало, 148а.
Тэл.: +375 (17) 336-70-52, zakaz@ag.by
Ліцэнзія № 02330/53 ад 03.04.2009 г.
выдана Міністэрствам інфармацыі РБ.
УНП 190147176
Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1609
Пасведчанне гігіенічнай
рэгістрацыі № 08-33-0.353692

0+

ISSN 2410-3659
9 772410 365000 19010

*Вокладка Аксаны АРАКЧЭЕВАЙ*